*Л.А.Дзямешка, прафесар*
*С.А.Паўлава, дацэнт*

# СТАТУС БІБЛІЯТЭКАРА Ў ГРАМАДСТВЕ

Бібліятэка як старажытны інстытут пісьменства, асветы, культуры, адукацыі заўсёды займала адно з важнейшых месцаў у жыцці грамадства. Таму прафесія бібліятэкара заслугоўвае асаблівай увагі ў наш час супярэчлівых пераўтварэнняў.

Прэстыж прафесіі залежыць ад аб’ектыўных працэсаў у грамадстве. Статус бібліятэкара ў грамадскай свядомасці перыядычна то ўзвышаўся, то зніжаўся.

Нагадаем, што ў Расіі ў XVIII ст. бібліятэкара цанілі, мяркуючы па аплаце яго працы, вышэй, чым обер-пракурора сената, губернатара, обер-сакратара сената, не кажучы ўжо аб простых сенатарах.

Высокі статус бібліятэкара быў і ў XIX – пачатку XX ст. У бібліятэках працавалі высокаадукаваныя людзі, вучоныя, пісьменнікі, кнігавыдаўцы, сапраўдныя інтэлектуалы.

У час савецкай улады зніжаецца прэстыж бібліятэчнай прафесіі. Сацыялагічныя даследаванні, праведзеныя ў былым СССР у 80-я гады XX ст., сведчаць, што толькі 2% вучняў старшых класаў з усіх апытаных лічылі гэтую прафесію прывабнай [4].

Зніжэнне статусу бібліятэкара і аўтарытэту бібліятэкі ў грамадстве на працягу XX ст. тлумачыцца некалькімі прычынамі. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі бібліятэка становіцца ідэалагічнай установай і губляе сваю асноўную функцыю – захавальніцы агульначалавечых духоўных каштоўнасцей, нацыянальнай памяці народа. Яе фонды не задавальняюць чытачоў, бо панеслі велізарныя страты з-за знішчэння кніг па ідэалагічных і палітычных матывах, многія кнігі сталі неда- ступнымі для грамадзян з-за стварэння спецыяльных закрытых кнігасховішчаў.

У пачатку 20-х гг. XX ст. былі распрацаваны інструкцыі па прагляду каталогаў і фондаў бібліятэк з доўгім пералікам літаратуры, якую належала знішчыць. У адной з інструкцый 1923 г. адзначалася, што “библиотеки наиболее устойчивы при свертывании разных старорежимных учреждений, и поэтому их надо старательно чистить от контрреволюционной и вредной литературы”. Складаліся спісы “шкоднай рэлігійнай” і проста

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

“шкоднай” літаратуры, якую па вялізнай краіне СССР кожны трактаваў, як хацеў. Для навуковых бібліятэк былі невялікія паслабленні, але тлумачылася: “...конечно, и из таких библиотек должны быть изъяты вредные книги, а один или два экземпляра под строжайшей ответственностью заведующих могут быть оставлены лишь для специальной и научной работы. Такие книги должны содержаться в особо запертых шкафах”.

Складаўся пералік аўтараў, творы якіх забаранялася чытаць. Пад забаронай аказалася творчасць Ясеніна, Дастаеўскага, Блока, Фета, Булгакава, Ахматавай, Гумілева, Валошына, Цвятаевай і інш.

Бібліятэкар патрэбен быў уладзе ў першую чаргу для паспяховай класавай барацьбы. Нездарма Н.К. Крупская раіць: “…библиотекарей и учителей надо подбирать с большой осмотрительностью, ибо главное в библиотекаре и учителе не талант, не душевные качества, а классовый подход к человеку или книге”.

У Беларусі забарона чытання і знішчэнне “шкодных” кніг здзяйсняліся сістэматычна і паслядоўна.

У 1926 г. прайшоў Усебеларускі сход загадчыкаў акружных палітасветаў, на якім стаяла пытанне аб мерах па паляпшэнні работы бібліятэк. У рэзалюцыі сходу адзначалася: “Ідэалагічны змест кніжнага складу бібліятэк у гарадскіх бібліятэках былых павятовых гарадоў і іншых не заўсёды адпавядае моманту, а таму неабходна ўзяць рашучы напрамак на заканчэнне працы па выключэнні ўстарэлых і прыдатных кніжак” [2, с. 91].

У рэзалюцыі Першай Усебеларускай клубнай нарады па пытаннях бібліятэчнай работы (1930) адзначана гэтая пазіцыя ўлад больш рэзка: “Нарада катэгарычна патрабуе пад адказнасць бібліятэчных работнікаў і загадчыкаў клубаў рашучай ачысткі бібліятэк ад непатрэбнай і варожай літаратуры” [2, с. 145]. Бібліятэкараў абавязалі “выводзіць” з чытацкага абароту кнігі “шкодных” аўтараў.

Прэзідыум Белсаўпрафа 11 снежня 1957 г. прыняў пастанову “Аб стане і мерах паляпшэння работы прафсаюзных бібліятэк”, у якой абвяшчаўся кантроль за своечасовым і поўным выключэннем з фондаў бібліятэк “устаревших” кніг па спісах, што выдаваліся Усесаюзнай кніжнай палатай [2, с. 250–251].

Камплектаванне бібліятэк здзяйснялася ў адпаведнасці з дзяржаўнай ідэалогіяй, прынцыпам партыйнасці: бібліятэкі атрымлівалі з Галоўліта СССР і Галоўліта БССР спісы забароненых

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

ці дазволеных твораў. (У 1991 г. гэтыя фонды былі рассакрэчаны і аб'яўлены агульнадаступнымі.)

Для фондаў бібліятэк Беларусі пагібельным стаў загад Галоўліта БССР пад № 33 ад 3 чэрвеня 1937 г. пад назвай "Спіс літаратуры, якая падлягае канфіскацыі з бібліятэк грамадскага карыстання, навучальных устаноў і кнігагандлю". Спіс "шкодных кніжак" заняў 111 старонак і налічваў 421 пазіцыю. У яго ўвайшлі кнігі Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, паэма "Тарас на Парнасе", тэрміналагічныя слоўнікі, даведнікі, граматыкі, чытанкі, падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, мовазнаўчыя працы. Спісы выдаваліся пад распіску дырэктарам бібліятэк і кнігарняў. Загад тлумачыў, як быць з канфіскаванай літаратурай: "...рабіць знішчэнне шляхам пропуску цераз рэзальныя машыны друкарняў; макулатуру ў дробна парэзаным выглядзе здаваць на утыль. У райцэнтрах, дзе няма рэзальных машын, літаратуру спальваць з адзнакай аб акце спалення". Такім чынам "шкодныя кнігі" гэтым загадам былі знішчаны, скасаваны ў каталогах і картатэках бібліятэк, а разам з імі загінуў і цэлы пласт нацыянальнай культуры Беларусі. Пасля сталінскіх рэпрэсій з фондаў бібліятэк зніклі і кнігі ўсіх рэпрэсіраваных аўтараў, а іх было 200 чалавек.

Загаду № 33 было наканавана доўгае жыццё. Ён захоўваў сілу дзесяцігоддзі. У 1954 г. "ачышчалі" бібліятэкі ад палітычна шкоднай літаратуры, у 1961 г. – ад твораў "здраднікаў і дысідэнтаў".

Паступова знішчалася аўтаномія бібліятэк як культурна-асветных цэнтраў; шырокім крокам ішла іх ідэалагізацыя. Бібліятэкі трацілі чытачоў, якія, не знаходзячы патрэбных і цікавых матэрыялаў, усё радзей звярталіся да іх.

Другой прычынай зніжэння статусу бібліятэкара ў грамадстве, на наш погляд, з'явілася цэнтралізацыя бібліятэк, якая на пэўным часе пазбавіла іх фінансавай і юрыдычнай самастойнасці, садзейнічала поўнай уніфікацыі структуры бібліятэк, іх кадраў, фондаў, кансерватызму метадаў і формаў абслугоўвання насельніцтва. Да таго ж астатачны прынцып фінансавання культуры наогул і бібліятэк у прыватнасці збядняў матэрыяльную базу, а бібліятэкары сталі самай нізкааплачваемай катэгорыяй сярод спецыялістаў. Аб бібліятэчным маркетынгу і сервісу (асабліва публічных бібліятэк) пытанне не ставілася, аб камп'ютэрызацыі навуковых бібліятэк і Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі задумаліся толькі ў канцы XX ст.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

Гэтыя ды і некаторыя іншыя прычыны, на наш погляд, спрыялі страце бібліятэкарамі прафесіяналізму, прафесійнай этыкі, прафесійнага гонару. Прафесія бібліятэкара з элітнай у мінулым ператварылася ў масавую, а бібліятэкар – з асветніка, дзеяча культуры, інтэлектуала – у паслухмянага выканаўцу, "байца ідэалагічнага фронту".

У канцы XX і ў пачатку XXI ст. імкліва мяняецца сітуацыя, на якую грандыёзны ўплыў аказалі адыход у мінулае ідэалагічнай функцыі бібліятэкі і інфарматызацыя грамад- ства. Роля бібліятэкара значна ўскладняецца. Сёння бібліятэкар павінен умець ствараць свой інфармацыйны прадукт (ад спіса навін, друкаванага рэкамендацыйнага паказальніка да агляду сайтаў у інтэрнеце ці "дамашняй старонкі" бібліятэкі); умець працаваць з інфармацыйнымі рэсурсамі, адшукваць менавіта тую інфармацыю, якая патрэбна карыстальніку; актыўна ўключаць бібліятэку ў асяроддзе арганізацый і фірмаў, устанаўліваць партнёрскія кантакты з вытворцамі і прадаўцамі інфармацыйных прадуктаў; падтрымліваць камп'ютэрную тэхніку, сеткі ў працаздольным стане, працаваць на ўсіх відах тэхнікі, якая маецца ў бібліятэцы.

Бібліятэкі ўсё часцей ператвараюцца ў поліфункцыянальныя ўстановы. Гэта выклікана тым, што яны вымушаны займаць вызваленыя сацыякультурныя нішы і браць на сябе задачы, уласцівыя іншым культурна-асветным, адукацыйным і выхаваўчым установам, якія часта перапрафілююцца, становяцца платнымі ці проста знікаюць. Ствараюцца бібліятэкі-філіялы новага тыпу: бізнес-бібліятэкі, цэнтры прававой інфармацыі, бібліятэкі-клубы, бібліятэкі-інтэрнет-кавярні, бібліятэкі-тэатры, бібліятэкі-аргатэкі, бібліятэкі-фанатэкі, медыятэкі і інш.

Яны паступова далучаюць да кніжнай культуры тую частку насельніцтва, якая па розных прычынах не наведвае традыцыйныя бібліятэкі. Спосабамі далучэння да кнігі становяцца святы кнігі, тэатралізаваныя прадстаўленні і інш.

З'явіўся тэрмін "карыстальнік бібліятэкі", пад якім разумеецца асоба ці арганізацыя, што звяртаецца да яе паслуг. Гэты тэрмін не замяняе паняцця "чытач". Карыстальнік можа быць наведвальнікам выставы, удзельнікам мерапрыемства, атрымальнікам даведкі і інш. Задача бібліятэкара – дапамагчы карыстальніку стаць сапраўдным чытачом.

Усё гэта сведчыць аб зменах у бібліятэчнай дзейнасці, патрабуе фарміравання новых інфармацыйных рэсурсаў, укаранення

БИБЛИОТЕКА БГУКИ

тэхналогій, заснаваных на камп’ютэрызацыі працэсаў, што ўплываюць на характар работы бібліятэкара, яе змест.

Бібліятэка становіцца інфармацыйнай установай. Выкарыстанне новых інфармацыйных тэхналогій, стварэнне тэлекамунікацыйных сетак прыводзяць да істотных змен у структуры, арганізацыі працы бібліятэк, наменклатуры спецыялістаў, патрабаваннях да іх.

Традыцыйна бібліятэкар меў справу з дакументамі на паперных носьбітах, якія не патрабавалі пры іх узнаўленні тэхнічных прыстасаванняў. У сучасны момант яму ўсё часцей даводзіцца працаваць з аўдыё- і відэаматэрыяламі, дыскетамі, кампакт-дыскамі, электроннымі выданнямі. Таму бібліятэкару патрэбна ведаць адпаведныя тэхнічныя сродкі. Сучасны бібліятэкар павінен валодаць камп'ютэрамі, ксераксам, сканерам, прынтэрам, мадэмам, відэатэхнікай. Усё часцей ён мае справу з віртуальнай інфармацыяй, якая па жаданні бібліятэкара або карыстальніка бібліятэкі з’яўляецца на экранах камп’ютэра, а затым пры неабходнасці знікае. Працуючы ў інфармацыйных сетках, бібліятэкар па сваіх магчымасцях прыраўноўваецца да ўсіх карыстальнікаў гэтых сетак. Ён становіцца адным са шматлікіх пастаўшчыкоў і карыстальнікаў інфармацыі, інфармацыйным спецыялістам.

Гэтая акалічнасць выклікае неабходнасць падрыхтоўкі бібліятэкараў новай фармацыі. Неабходна з’яўленне такіх спецыялістаў, як бібліятэкар-тэхнолаг, бібліятэкар-арганізатар баз даных, менеджэр інфармацыйных сістэм.

Развіццё WWW-сервісу інтэрнета абумовіла таксама неабходнасць падрыхтоўкі спецыялістаў па стварэнні і абнаўленні WEB-старонак; бібліятэкараў, якія б спецыялізаваліся ў галіне электроннай выдавецкай дзейнасці, правядзенні трэнінгаў па інтэрнэце для супрацоўнікаў і карыстальнікаў бібліятэк. Патрэбны спецыялісты па арганізацыі тэлеканферэнцый.

На змены ў бібліятэчнай прафесіі ўплывае і сацыяльная арыентацыя многіх публічных бібліятэк. Яна абумовіла неабходнасць з’ялення такіх спецыялістаў, як бібліятэкар-псіхолаг, бібліятэкар па абслугоўванні сацыяльна не абароненых груп насельніцтва, а ў дзіцячых бібліятэках – бібліятэкара-педагога. Вялікая ўвага надаецца праблемам работы бібліятэкара як бібліятэрапеўта. У бібліятэках хутка спатрэбяцца спецыялісты па бібліятэчным дызайне, а сацыяльныя і маркетынгавыя даследаванні

БІБЛІЯТЭКА БГУКІ

ў бібліятэках ужо патрабуюць такіх спецыяльстаў, як бібліятэкар-сацыёлаг, бібліятэкар-даследчык.

Патрэбна адзначыць яшчэ адну прымету часу. Сэнс бібліятэчнай інаватыкі не толькі ва ўкараненні інфармацыйных тэхналогій, якія абапіраюцца на камп’ютэрную тэхніку. Не менш значнымі з’яўляюцца і сацыяльныя тэхналогіі, новыя формы сувязі з грамадскасцю, запаўненне сваёй нішы ў шматаспектнай культурна-асветніцкай дзейнасці розных устаноў.

Бібліятэкі сталі больш адкрытымі для грамадства. Яны распрацоўваюць і праводзяць у жыццё сацыякультурныя мерапрыемствы, мэтавыя дабрачынныя праграмы і праекты: “Жыццё патрабуе міласэрнасці” (Нацыянальная бібліятэка Беларусі), “Міласэрнасць” (бібліятэкі Мінскай вобласці), “Дабрыня” (бібліятэкі Светлагорскага р-на Гомельскай вобласці), “Мы разам. Мы патрэбны адзін аднаму” (бібліятэкі г.Мінска). Мэтавыя праграмы – даволі эфектыўная форма работы ў вырашэнні многіх надзённых праблем грамадства. У іх здзяйсненні, як правіла, задзейнічаны ўладныя структуры, СМІ, прававыя ўстановы, афіцыйныя і дабрачынныя арганізацыі. Гэтая акалічнасць патрабуе асобай спецыяльнасці, якую можна было б назваць “менеджэр бібліятэчных сацыякультурных праграм”.

Такім чынам, для бібліятэчнай прафесіі характэрныя тэхнізацыя, тэхналагізацыя, сацыяльная накіраванасць, інтэлектуалізацыя, адкрытасць.

Выхад на шырокую аўдыторыю патрабуе ад бібліятэкара больш высокай культуры. Значэнне набываюць прафесійная этыка, своеасаблівы стандарт прафесійнага разумення і паводзін. Яго вырашэнне цалкам залежыць ад саміх бібліятэкараў. Таму ўяўляецца важнай задача адраджэння асабістай годнасці бібліятэкара. Ідэал самастойнай асобы, арыентаванай на асабістыя поспехі, асабістыя дасягненні, адказнай за сябе, – гэта тая каштоўнасць, якую патрэбна ўлічваць, асабліва кіраўнікам бібліятэк, у працы з персаналам.

1. *Библиотечное* дело БССР: документы и материалы 1918–1941. – Мн.: Вышэйш. шк., 1978. – 311 с.

2. *Симонов Б.* Профессия, которую не выбирают / Библиотекарь. – 1998. – № 2. – С. 32–33.

БИБЛИОТЕКА БГУКИ